УДК 37(476)(091)“16-17”

# ВЫХАВАНЦЫ КІЕВА-МАГІЛЯНСКАГА КАЛЕГІУМА ВА ЎНІЯЦКІХ І КАТАЛІЦКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII – ПАЧАТКУ XVIII СТАГОДДЗЯ

*Самусік Андрэй Фёдаравіч*
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*Аналізуюцца адукацыйныя паездкі выпускнікоў Кіева-Магілянскага калегіума ў навучальныя ўстановы Рэчы Паспалітай, а таксама ў Рымскія калегіі ў другой палове XVII – пачатку XVIII ст. Адзначана, што менавіта яны, нягледзячы на часовы пераход ва ўніяцтва, паспрыялі заняццю імі вышэйшых царкоўных пасад у Рускай праваслаўнай царкве.*

Паўстанне казакоў на чале з гетманам Б. Хмяльніцкім у 1648 г., якое ў 1654 г. перарасло ў вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй надзвычай негатыўна паўплывала на ўсе сферы штодзённага жыцця. Спусташэнне гарадоў, бежанства і голад сталі прычынай эканамічнага і культурнага заняпаду беларускіх і ўкраінскіх зямель. Адной з праяў апошняга было паўсюднае закрыццё навучальных устаноў. Не абышло ваеннае ліхалецце і Кіева-Магілянскі калегіум – вядучы праваслаўны асветніцкі асяродак у Рэчы Паспалітай. У гэты перыяд ён некалькі разоў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

увогуле спыняў сваю дзейнасць (1651–1655, 1658–1660, 1665–1666 гг.), а ў апошні час у ім працавалі толькі малодшыя класы [5, с. 24–30].

Адраджэнне Кіева-Магілянскага калегіўма пасля заканчэння баявых дзеянняў зацягнулася. Акрамя іншага, прычына гэтага крылася ў недастатковым фінансаванні яго дзейнасці [7, с. 140]. Пры такім развіцці падзей зусім не дзіўна, што шмат каго з мясцовых выхаванцаў не задавальняў узровень атрыманай імі адукацыі і яны былі вымушаны шукаць альтэрнатыўныя варыянты яе ўдасканалення.

Адзінай рэальнай магчымасцю для іх было адправіцца на вучобу да езуітаў ці ўніятаў у Рэч Паспалітую. Але перашкодай для залічэння было праваслаўнае веравызнанне. У выніку ў асяроддзі выпускнікоў Кіева-Магілянскага калегіума пашырылася практыка часовай змены рэлігіі. Так, А. Кракоўскі вучыўся ў Кіеве да 1670 г., пасля чаго пераехаў у Рэч Паспалітую, дзе прыняў уніяцтва і ўступіў у Быценскім навіцыяце ў базыльянскі ордэн. Узровень яго падрыхтоўкі дазволіў атрымаць накіраванне ў Рымскую Грэчаскую калегію. У 1683 г. ён вярнуўся на радзіму, зноў прыняў праваслаўную веру і з 1689 г. распачаў у Кіеве выкладанне багаслоўя [3, с. 297–298]. С. Яворскі, у сваю чаргу, скончыў Кіева-Магілянскі калегіум у 1684 г. і таксама прыняў уніяцтва, што дазволіла яму паступіць у езуіцкія навучальныя ўстановы ў Львове, Любліне, Познані і Вільні, дзе: “прошел вся учения грамматическая, стихотворская, риторская, философская и богословская”, атрымаўшы дыплом магістра свабодных навук і філасофіі. Праз пяць год ён вярнуўся ў Кіеў, адкрокся ад уніі, і “церковь о чадех своих пекущися и Отцу небесному сообразная, примером блудного сына, Стефана приняла и властию ключей Христовых простила и разрешила” [4, с. 413–414]. Падобным чынам паступіў і Ф. Лапацінскі, які пасля вучобы ў Кіеве стаў базыльянінам у Быцені і паступіў у Рымскую Грэчаскую калегію. За час свайго навучання ён засвоіў каля дзясятка класічных і сучасных моў, матэматыку, філасофію і тэалогію [2, с. 332]. У 1698 г. Кіева-Магілянскую акадэмію скончыў Ф. Пракаповіч, які перайшоў ва ўніяцтва зноў-такі ў Быценскім навіцыяце, адкуль быў накіраваны прэфектам ва Уладзімірскую школу (вёў заняткі па рыторыцы і паэтыцы). За праяўленыя здольнасці да адукацыі ў 1701 г. яго адправілі ў Грэчаскую калегію ў Рыме, дзе ён “обучался красноречию, поэзии… изучал римские древности, как христианские, так и языческие… выслушал полный курс аристотелической философии и схоластического богословия…”. Праз тры гады, вярнуўшыся ў Кіеў, Ф. Пракаповіч таксама быў “к Церкви Божией принят и разрешён”, пасля чаго пачаў выкладаць паэтыку ва ўласнай “Alma mater”. Прычым І. Чыстовіч, каментуючы гэту старонку яго біяграфіі, адзначаў: “Это было в порядке вещей… Все киевские коллегиаты, доканчивавшие свое образование в польских училищах, должны были сделаться униатами” [11, с. 2–8].

Азначаная часовая “здрада” праваслаўю ў той перыяд не мела аніякіх негатыўных наступстваў у плане кар’ернага росту гэтых асоб. А. Кракоўскі ў 1689 г. стаў рэктарам Кіева-Магілянскай акадэміі, а ў 1708 г. – мітрапалітам Кіеўскім. Ф. Лапацінскі ў 1706 г. узначаліў Маскоўскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію, а ў 1723 г. быў прызначаны архіепіскапам Цвярскім і Кашынскім са статусам віцэ-прэзідэнта Св. Сінода [8, с. 111, 126, 129, 161]. У 1700 г. С. Яворскі стаў мітрапалітам Разанскім і Мурамскім, а таксама “местоблюстителем патриаршего престола” – фактычным кіраўніком Рускай праваслаўнай царквы. Ф. Пракаповіч у 1718 г. заняў пасаду епіскапа Пскоўскага і Нарвскага, адначасова з’яўляючыся бліжэйшым дарадцам Пятра І па духоўных справах. З 1721 г. ён кіраваў Св. Сінодам і падрыхтаваў “Духоўны рэгламент”, па якім Руская праваслаўная царква функцыянавала ажно да 1917 г. [6, с. 257–261, 268–280].

Пры гэтым адметна, што для кожнага з іх своеасаблівымі “дзвярыма” ў свет заходнееўрапейскай адукацыі з’явіўся Быценскі навіцыят. Прычына гэтага крылася ў тым, што менавіта далучэнне да базыльянскага ордэна адкрывала шлях да стыпендый і вакантных месцаў у бурсах езуіцкіх калегіумаў, папскіх алюмнатаў і Рымскіх калегій.

Адпраўляліся ў дадзены перыяд на вучобу ў Рэч Паспалітую і іншыя выхаванцы Кіева-Магілянскага калегіума. У іх біяграфіях не адзначаны факт змены веравызнання, але трапіць у езуіцкія навучальныя ўстановы іншым шляхам было немагчыма. Сярод падобных асоб можна назваць Ц.І. Капланскага (Паклонскага), які пасля вучобы ў Кіеве напрыканцы 1670-х гг. тры гады вывучаў рыторыку ў Нясвіжы (“у езуіта Юдзейкі”), а потым, у пачатку 1680-х гг., столькі ж часу правёў у Львове, дзе поруч з той жа рыторыкай праслухаў яшчэ і курс філасофіі. У 1682 г. ён вярнуўся на Украіну, дзе стаў іераманахам у Чарнігаўскім Успенскім манастыры [9, с. 251–252]. Адметны і прыклад Г. Вішнеўскага, які на мяжы XVII–XVIII стст. адправіўся з Кіева на вучобу ў Львоў, Вільню і Кракаў. Атрыманне ступені доктара філасофіі дазволіла яму ўзначаліць у 1720 г. Маскоўскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію, а яшчэ праз восем год стаць епіскапам Смаленскім [1, с. 119].

Варыянт, які дакладна даваў магчымасць пазбегнуць пераходу ва ўніяцтва з тагачасных выпускнікоў Кіева-Магілянскага калегіума, абраў ураджэнец Брэсцкага ваяводства В. Ясінскі. Пасля завяршэння навучання ў ім у пачатку 1650-х гг. ён адправіўся ў лютэранскую гімназію Эльблонга, папскі алюмнат Аламоўца, а потым у Замойскую (1657) і Кракаўскую акадэміі. У апошняй ён атрымаў ступень доктара філасофіі і ў 1661 г. вярнуўся ў Кіеў на пасаду прафесара паэтыкі і рыторыкі. Праз 5 год В. Ясінскі стаў тутэйшым рэктарам, у 1684 г. заняў пасаду архімандрыта Кіева-Пячорскай лаўры, а ў 1690 г. – мітрапаліта Кіеўскага [10, с. 617].

Прыведзеныя прыклады навучання выхаванцаў Кіева-Магілянскага калегіума ў Рэчы Паспалітай, ды яшчэ і са зменай веравызнання, дагэтуль не сталі прадметам асобнага даследчага інтарэсу. Разам з тым іх аналіз дае магчымасць лепш зразумець спецыфіку тагачаснага развіцця праваслаўнай адукацыі ва ўсім усходнеславянскім рэгіёне. Відавочна, што менавіта Кіеў рыхтаваў большую частку кадраў для заняцця ў ім духоўных і настаўніцкіх пасад. Аднак яго вучэбная праграма не дазваляла дасканала авалодаць класічнымі мовамі, красамоўствам і філасофіяй. Гэта прымушала лепшых тутэйшых выпускнікоў адпраўляцца да езуітаў і ўніятаў, школы якіх часцяком разглядаліся імі своеасаблівай “прыступкай” для атрымання вышэйшай адукацыі ў Вільні, Кракаве ці Рыме. Апошняя ж у спалучэнні з атрыманымі там доктарскімі дыпломамі ў далейшым адкрывала ім шлях да самых высокіх пасад у Рускай праваслаўнай царкве.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Андрушко, В. О. Вишневський чернече ім’я Ґедеон / В. О. Андрушко // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII–XVIII ст. : Енцикл. вид. / упоряд. З. І. Хижняк ; за ред. В. С. Брюховецького. – Київ : Вид. дім «КМ Академія», 2001. – С. 119.
2. Андрушко, В. О. Лопатинський Федір, чернече ім’я Теофілакт / В.О. Андрушко, З. І. Хижняк // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII–XVIII ст. : Енцикл. вид. / упоряд. З. І. Хижняк ; за ред. В.С. Брюховецького. – Київ : Вид. дім «КМ Академія», 2001. – С. 332.
3. Верьовка, А. С. Кроковський Олександр, чернече ім’я Иоасаф / А. С. Верьовка // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII–XVIII ст. : Енцикл. вид. / упоряд. З. І. Хижняк ; за ред. В. С. Брюховецького. – Київ : Вид. дім «КМ Академія», 2001. – С. 297–299.
4. Королёв, А. Стефан Яворский / А. Королёв // Русский биографический словарь : в 25 т. / изд. под наблюдением председателя Императорского Русского Исторического Общества А.А. Половцова. – СПб. ; М., 1896–1918. – Т. 19 : Смеловский – Суворина. – СПб. : Тип. товарищества «Общественная польза», 1909. – С. 413–414.
5. Петров, Н. И. Киевская академия во второй половине XVII века / Н. И. Петров. – Киев : Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1895. – 177 с.
6. Самарин, Ю. Ф. Сочинения / Ю. Ф. Самарин : в 12 т. – М. : Д. Самарин, 1877–1911. – Т. 5 : Стефан Яворский и Феофан Прокопович. – 1880. – XCII, 464 с.
7. Тітов, Ф. Стара вища освіта в Київській Україні XVI – поч. XIX в. / Ф. Тітов. – Київ : Друкарня Української Академії Наук, 1924. – 434 с.
8. Хижняк, З. І. Історія Києво-Могилянської академії / З. І . Хижняк, В. К. Маньківський. – Київ : Видавничий дім “КМ Академія”, 2003. – 184 с.
9. Хижняк, З. І. Капланський (Поклонський) Тимофій Іванович, чернече ім’я Тарасій / З. І. Хижняк // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII–XVIII ст. : Енцикл. вид. / упоряд. З. І. Хижняк ; за ред. В. С. Брюховецького. – Київ : Вид. дім «КМ Академія», 2001. – С. 251–252.
10. Хижняк, З. І. Ясинський, чернече ім’я Варлаам / З. І. Хижняк // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII–XVIII ст. : Енцикл. вид. / упоряд. З. І. Хижняк ; за ред. В. С. Брюховецького. – Київ : Вид. дім «КМ Академія», 2001. – С. 617–619.
11. Чистович, И. А. Феофан Прокопович и его время / И. А. Чистович. – СПб. : Тип. Имп. Академии наук, 1868. – X, 751 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова